твораў характэрны паказ гістарычнай эпохі, сапраўдных гістарычных асоб, выкарыстанне выказванняў іншых людзей пра Я. Купалу. У рамане А. Лойкі мы сустракаем унутраныя маналогі, сны Купалы, лірычныя развагі апавядальніка, і нават "Інтэв'ю аўтара кнігі ў Я. Купалы", а таксама лісты наратара да паэта. Апавядальнік у дадзеным творы эксплiцытны дыегетычны. У аповесці З.Бандарынай змешчаны ўнутраныя маналогі, сны, а таксама ўжываюцца фальклорныя ўстаўкі. У рамане-эсэ А. Лойкі "Як агонь, як вада" і аповесці З. Бандарынай "Ой, рана на Івана" вобраз Я. Купалы раскрываецца не аднолькава. І, зразумела, большы па аб'ёме жанр – раман больш шырока поўна і разнабакова апісвае жыццё паэта.

Галоўнай адметнасцю ў раскрыцці галоўнага персанажа З. Бандарынай з'яўляецца тое, што яна нічым не імкнецца падкрэсліць, што перад намі будучы паэт. А. Лойка, наадварот, паказаўшы паэта ў розных аспектах жыцця, стараецца прадставіць яго геніем, боскім песняром у звычайным чалавечым абліччы. Аповесць З. Бандарынай – першая мастацкая біяграфія пра Я. Купалу. У ёй мы бачым станаўленне Я. Купалы як чалавека і як вялікага паэта. Раман А. Лойкі адлюстроўвае ўжо арганізаваную асобу творцы і расказвае многа новага, свежага, нязнанага. Аўтар упершыню распрацаваў, напрыклад, сюжэтныя лініі пра ўзаемаадносіны Купалы з Марыяй – Лазіну Пяледай, Ласоўскім. Аповесць З. Бандарынай і раман А. Лойкі з'яўляюцца каштоўнымі з'явамі ў кантэксце развіцця жанра дакументальна-мастацкай біяграфіі ў беларускай літаратуры.

## ИМЕНА И НАЗВАНИЯ БОЖЕСТВА В НОВОМ ЗАВЕТЕ

***А. И. Феклистова*** *(УО «ГГУ им. Ф. Скорины»)*
*Научн. рук.* ***Н. И. Шабулдаева,***
*канд. филол. наук, доцент*

Божественные имена, представленные в Новом Завете, относятся к образу Иисуса Христа. Обращение к Богу (Иисусу Христу) осуществлялось прежде всего описательными метафорическими формами имен и названий. В основе же выбора, появления в сознании людей той или иной номинации лежали представления о миссии Божества, его характере и сущности. Прямая номинация Божественного лица в Новом Завете – явление довольно редкое. Это может говорить об особом священном статусе таких имен: *Иисус* буквально означает «Бог – моя помощь, спасение», *Христос* определяется как «помазанник», или «мессия» (*Спаситель Иисус; Мессия, то есть Христос; Спаситель мира, Христос; Помазанник* и др.). Гораздо чаще встречаются составные, описательные имена и названия, не содержащие собственно компоненты *Иисус* и *Христос*. Наиболее интересны следующие смысловые блоки имен Иисуса Христа.

1) Имена и названия с центральным понятием *сын*: *Сын Божий, Сын Человеческий, Сын Давидов, Сын Авраамов, Сын Марии, Плотников Сын, Сын Царя, Сын данный, Сын Всевышнего* и др. Данные имена характеризуют Его не только как Божественное существо, но и указывают на непосредственное отношение к роду человеческому. Это говорит о вездесущности Божественного.

2) Имена и названия с характеризующими флористическими понятиями так же, как и предыдущая группа, указывают на биологические родство: *Семя жены, Семя Авраамово, Семя Давидово, Корень Давидов, Ветвь от корня Иессеева, Отрасль Господа, Истинная виноградная Лоза, Нарцисс Саронский, Лилия долин, Мирровый пучок, Кисть Кипера* и др.

3) Имена и названия с семантическим компонентом *пастырь*: *Пастырь Господень, Пастырь овец, Пастырь Израиля, Пастырь Добрый, Пастыреначальник* и др. Важность дела пастыря в древней Палестине в устах Христа приобретает здесь иносказательный смысл. Он (Иисус) есть духовный защитник.

4) Имена и названия с центральным смысловым компонентом – понятием *хлеб*: *Хлеб Божий, Истинный хлеб с небес, Хлеб жизни, Хлеб живой* и др. Хлеб как основная

пища людей становится пищей духовной (хлеб = Слово Божье), помогая приблизиться к Божественному.

Это лишь некоторые семантические группы названий Божества в Новом Завете. Данный тип классификации выделяет также блоки имен, например, с такими компонентами, как *Агнец, Храм, Посланник, Дверь, Царь, Пророк, Свидетель, Вождь, Свет, Звезда, Солнце.*

## ІДЭЙНА-МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ АКТАЎ Н. ГІЛЕВІЧА

***Н. М. Філон** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір. **І. Ф. Штэйнер***
*доктар філал. навук, прафесар*

У беларускай літаратуры паняцце актавы відазменена. Так, у зборніку Н. Гілевіча “Актавы” (1976) пад дадзенай паэтычнай формай падразумяваюцца не толькі класічныя актавы, але і васьмірадковыя вершы рознай рыфмоўкі. Галоўнай асаблівасцю актаў з’яўляецца вобразнае, але адначасова лаканічнае выражэнне аўтарскіх думак, эмоцый, жыццёвай філасофіі паэта. Класічнымі актавамі ў строгім сэнсе гэтага паняцця з’яўляюцца не ўсе вершы: большасць з іх мае перакрыжаваную рыфму. Такім чынам, наследаванне класічнай традыцыі выражаецца ў асноўным у выкарыстанні васьмірадкоўя як формы верша. “Актавы” Н. Гілевіча – “творы пераважна медытацыйнай лірыкі, падказаныя ўстаноўкай на лаканічнае выяўленне роздуму над сутнасцю сучаснага і чалавека” [1, с. 181]. Скразным вобразам, што аб’яўдноўвае вершы Н. Гілевіча розных гадоў у адзінае мастацкае цэлае, з’яўляецца вобраз Радзімы.

З пункту гледжання спалучэння класічнай формы і арыгінальнага зместу найбольшую цікавасць выклікае акраверш, прысвечаны каханай жанчыне “Мілая мая” [2, с. 107]. Н. Гілевіч нават у інтымнай лірыцы праяўляе сябе як тонкі сатырык, што складае адну з яскравых асаблівасцей яго паэтычнага таленту. Майстэрства паэта праяўляецца ва ўмелым спалучэнні рознастылёвай лексікі (*рай прынадлівага поўдня – цёплае, як пойла*), стварэнне мастацкай іроніі праз шэраг трапных параўнанняў (*што ў балотцы жабурыння*). Насуперак класічным правілам вершаскладання, якія патрабавалі выкарыстання ў цвёрдых вершаваных формах “высокай” лексікі, паэт смела эксперыментуе. Пры гэтым стылістычная зніжанасць верша не перашкаджае лірычнаму герою выразіць свае пачуцці, а таксама скептычнае стаўленне да курортнага асяроддзя і ўласнай творчасці.

Такім чынам, з пункту погляду выкарыстаных паэтычных сродкаў Н. Гілевіч паўстае як паэт, які актыўна выкарыстоўвае метафары (як класічныя, так і арыгінальна-аўтарскія), уводзіць у паэзію алегарычныя вобразы, антытэзы, выдатна валодае рознымі стылямі беларускай мовы.

**Літаратура**

1 Калеснік, У. Матэрыя пачуцця / У. Калеснік // Маладосць. – 1976. – № 11. – С. 178–182.
2 Гілевіч, Н. Актавы / Н. Гілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 144 с.

## УЗАЕМАСУВЯЗЬ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ І НАВУКОВА-КРЫТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ В. ЛАСТОЎСКАГА

***А. У. Цітоў** (УА «МДУ імя А. А. Куляшова»)*
*Навук. кір. **А. В. Шарапава**,*
*ст. выкладчык*

В. Ю. Ластоўскі сцвердзіў сябе як неардынарны дзяржаўны, палітычны і грамадскі дзеяч нацыянальнага кірунку, арыгінальны навуковец у галіне гісторыі, этнаграфіі,